# Штодзённа ўмацоўваць сувязь з масамі—важнейшы абавязак партыйных арганізацый

*В. Лабанок,*

*сакратар Палескага абкома КП Беларусі*

Комуністычная партыя Совецкага Саюза ва ўсёй сваёй дзейнасці нязменна кіруецца рэволюцыйным вучэннем марксізма-ленінізма, якое з'яўляецца навуковым выражэннем карэнных інтарэсаў шматмільённых працоўных мас.

Марксізм-ленінізм навукова даказаў, што народныя масы адыгрываюць рашаючую ролю ў грамадскім развіцці, з'яўляюцца творцамі гісторыі, ствaральнікамі ўсіх матэрыяльных і культурных здабыткаў.

Таму зусім зразумела тое выключна важнае значэнне, якое надае Комуністычная партыя ўмацаванню і расшырэнню сваіх сувязей з працоўнымі масамі, з народам. В. І. Ленін і І. В. Сталін вучаць нашу партыю ні на мінуту не аслабляць сувязей з масамі, чула прыслухоўвацца да голасу так званых «маленькіх людзей», «вінцікаў», бо пастаянная сувязь з шырокімі масамі працоўных, уменне не толькі вучыць масы, але і вучыцца ў іх з'яўляецца трывалай асновай правільнага кіраўніцтва комуністычным будаўніцтвам.

Вучэнне партыі аб неабходнасці пастаянна ўмацоўваць сувязі з масамі знайшло сваё поўнае выражэнне ў Статуце КПСС, прынятым XIX з'ездам партыі. Статут абавязвае ўсіх комуністаў штодзённа ўмацоўваць сувязь з масамі, своечасова адклікацца на запатрабаванні і патрэбы працоўных, растлумачваць беспартыйным масам сэнс палітыкі і рашэнняў партыі, памятаючы, што сіла і непераможнасць нашай партыі ў яе кроўнай і непарыўнай сувязі з народам.

Няўхільнае ажыццяўленне гэтага патрабавання Статута забяспечвае Комуністычнай партыі пастаяннае падтрыманне найшырэйшых мас совецкага народа.

Наша партыя, як палітычны правадыр народа, ставіць перад ім чарговыя задачы, узнімае, мабілізуе энергію мас на паспяховае выкананне гэтых задач. І чым больш складанымі з'яўляюцца задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, тым большае значэнне набывае арганізатарская і палітычная работа партыйных арганізацый сярод працоўных мас.

Новыя, велічныя задачы будаўніцтва комуністычнага грамадства ў нашай краіне, пастаўленыя XIX з'ездам партыі, патрабуюць далейшага развіцця творчай ініцыятывы працоўных, няўхільнага ўздыму соцыялістычнага спаборніцтва, мабілізацыі ўсіх сіл і энергіі совецкага народа на выкананне пятага пяцігадовага плана. Гэта абавязвае партыйныя арганізацыі значна ўзмацніць арганізатарскую і палітычную работу ў масах, выкарыстоўваючы ўсе яе формы для далейшага расшырэння і ўмацавання сувязей з народам.

Вопыт партыйных арганізацый нашай вобласці паказвае, што лепшых вынікаў у рабоце дабіваюцца тыя партарганізацыі, якія штодзённа клапоцяцца аб умацаванні сваіх сувязей з працоўнымі, пастаянна працуюць з масамі і ўцягваюць іх у актыўную барацьбу за ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада.

У гэтай справе выключна вялікая роля належыць пярвічным партарганізацыям. Пярвічныя партыйныя арганізацыі, якія ажыццяўляюць непасрэдную сувязь партыі з масамі, праводзяць вялікую работу па ператварэнню ў жыццё дырэктыў і рашэнняў партыі. Ад дзейнасці пярвічных партарганізацый, ад іх умення пастаянна згуртоўваць вакол сябе беспартыйны актыў, працоўных ва многім залежаць нашы поспехі на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Адным з перадавых раёнаў Палескай вобласці з'яўляецца Тураўскі раён. Гэта можна растлумачыць перш за ўсё тым, што раённы камітэт партыі і яго сакратар тав. Башлыкоў М. Ф. пастаянна апіраюцца на пярвічныя партарганізацыі, дапамагаюць ім у рабоце, жыва цікавяцца становішчам спраў на месцах. Пярвічныя партыйныя арганізацыі ў гэтым раёне ёсць у 13 калгасах з 14. Большасць комуністаў працуе на розных участках калгаснай вытворчасці, з'яўляючыся сапраўднымі арганізатарамі калгаснікаў на барацьбу за своечасовае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Работнікі раённага камітэта партыі часта наведваюць пярвічныя партыйныя арганізацыі, калгасы, МТС, прадпрыемствы, установы, штодзённа зносяцца з комуністамі, рабочымі, калгаснікамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі і інтэлігенцыяй, прыслухоўваюцца да сігналаў знізу, аператыўна прымаючы меры да знішчэння недахопаў у рабоце, сістэматычна выступаюць перад працоўнымі з лекцыямі і дакладамі на палітычныя, прыродазнаўча-навуковыя і іншыя тэмы. Такі метад кіраўніцтва пастаянных зносін з працоўнымі дае станоўчыя вынікі, забяспечвае далейшы рост і ўмацаванне пярвічных партыйных арганізацый і іх уплыў сярод рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі.

Практыка паказвае, што тыя партыйныя камітэты, якія аслабляюць сувязь з пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, з шырокімі масамі працоўных, паступова трацяць сваю ролю як органы палітычнага кіраўніцтва. Так, напрыклад, аслабленне сувязей з пярвічнымі партарганізацыямі, з шырокімі масамі калгаснікаў прывяло Камарынскі райком КПБ да таго, што ён перастаў спраўляцца з рашэннем многіх гаспадарчых і палітычных задач. Трэба адзначыць, што райком партыі ў апошні час зусім перастаў заслухоўваць на бюро справаздачы аб рабоце калгасных партарганізацый, нездавальняюча працуе з сакратарамі партарганізацый, мала аказвае ім практычнай дапамогі ў наладжванні партыйна-арганізацыйнай і масава-палітычнай работы. Работнікі райкома КПБ рэдка бываюць у калгасах, у МТС, дрэнна ведаюць становішча спраў на месцах. Не выпадкова таму раён адстае з правядзеннем гаспадарча-палітычных кампаній.

Задача заключаецца ў тым, каб значна палепшыць кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, сістэматычна заслухоўваць справаздачы аб іх рабоце, навучаць сакратароў партарганізацый практыцы і метадам партыйнай работы. Кіруючым партыйным работнікам трэба часцей бываць на месцах, пастаянна цікавіцца жыццём пярвічных партарганізацый, дапамагаць ім, усямерна развіваць іх ініцыятыву ў абмеркаванні рашэнняў найбольш важных і актуальных задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Добра наладжаная палітычная работа ў масах, пастаянныя клопаты партыйных арганізацый аб павышэнні соцыялістычнай свядомасці працоўных — адна з важнейшых умоў сувязей партыі з народам.

Вопыт правядзення агітацыйнай і прапагандысцкай работы паказвае, што там, дзе клапоцяцца аб яе змесце, высокай ідэйнасці, даходчывасці, цесна ўвязваючы агітацыю і прапаганду з задачамі гаспадарчага і куль-

турнага будаўніцтва, там, як правіла, вышэй працоўная і палітычная актыўнасць мас.

Заслугоўвае ўвагі вопыт правядзення масава-палітычнай работы пярвічнай партарганізацыяй калгаса імені Сталіна Жыткавіцкага раёна. Тут на партыйных сходах сістэматычна абмяркоўваюцца пытанні ідэалагічнай работы. Партыйная арганізацыя ажыццяўляе штодзённа кантроль за работай агітатараў, дае ім практычныя парады, як неабходна будаваць і праводзіць гутаркі, каб яны былі цесна ўвязаны з жыццём сельгасарцелі і зразумелы калгаснікам. Глыбокае веданне агітатарамі жыцця калгаса дапамагае партыйнай арганізацыі своечасова знішчаць недахопы ў рабоце.

Напрыклад, у перыяд падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы агітатары тт. Макарэвіч, Рагалевіч і Купрацэвіч даведаліся, што сярод некаторай часткі калгаснікаў паляводчых брыгад склалася думка не спяшацца з вясенне-палявымі работамі, што, моў, паспеем і т. д. Такі нездаровы настрой, калі-б ён распаўсюдзіўся, мог прывесці да спазнення з выкананнем плана веснавой сяўбы, а таксама і іншых сельскагаспадарчых работ. Агітатары своечасова паставілі гэтае пытанне на абмеркаванне партыйнай арганізацыі. Пасля партыйнага схода пытанне аб тэмпах веснавой сяўбы шырока абмяркоўвалася на брыгадных сходах калгаснікаў. Агітатары ў сваю чаргу правялі вялікую растлумачальную работу сярод членаў сельгасарцелі. Няправільная думка асобных адсталых калгаснікаў, што тэрміны веснавой сяўбы можна расцягнуць, была абвергнута пры аднадушным падтрыманні ўсіх членаў сельгасарцелі. У выніку калгас імені Сталіна своечасова скончыў палявыя работы і адным з першых у раёне справіўся з веснавой сяўбой. На гэтым прыкладзе відаць, як правільная пастаноўка масава-палітычнай работы дапамагае партыйным арганізацыям умацоўваць сувязі з працоўнымі і аказваць на іх рашаючы ўплыў. Такіх прыкладаў з жыцця партыйнай арганізацыі вобласці можна было-б прывесці вельмі многа.

Аднак не трэба адмаўляць і той факт, што ў радзе партыйных арганізацый нашай вобласці масава-палітычная работа ўсё яшчэ адстае ад тых патрабаванняў, якія прад'яўляе партыя. Есць яшчэ такія райкомы партыі, якія недастаткова ўдзяляюць увагі масава-палітычнай рабоце сярод насельніцтва. Ні чым іншым, як толькі запушчанасцю масава-палітычнай работы можна растлумачыць той факт, што Даманавіцкі райком КПБ вельмі дрэнна спраўляецца з выкананнем раду гаспадарча-палітычных задач. Раённы камітэт партыі і яго сакратар тав. Пастухоў пытаннямі палітычнай работы займаюцца ад выпадку да выпадку. Семінары і нарады кіраўнікоў агіткалектываў і агітатараў праводзяцца рэдка, без належнай падрыхтоўкі, часта наспех, у выніку чаго агітатары не атрымліваюць неабходнай тэарэтычнай і метадычнай дапамогі ў сваёй рабоце. Райком партыі зусім забыў асноўны метад работы партыі з масамі — метад пераканання.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі патрабуе, каб кіруючыя партыйныя работнікі актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні масава-палітычнай работы, выступалі з палітычнымі дакладамі сярод насельніцтва. Растлумачэнне масам палітыкі і рашэнняў партыі, прапаганда ідэй марксізма-ленінізма — важнейшы абавязак і высакародная справа кожнага комуніста і, у першую чаргу, кіруючых работнікаў. Жывыя зносіны з народам узбагачаюць кіраўніка вопытам мас, умацоўваюць сувязь партыйных арганізацый з працоўнымі, мабілізуюць іх на выкананне дырэктыў і рашэнняў партыі.

Абласны камітэт партыі, арганізуючы выступленні кіруючых работнікаў з палітычнымі дакладамі сярод насельніцтва, патрабуе ад іх не

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы